**Рынкевіч, К.** «Брат радаваўся, што будзе кіраваць КамАЗам» / К. Рынкевіч // Мiёрскія навіны. — 2019. — 5 лют. — С. 5.

## «БРАТ РАДАВАЎСЯ, ШТО БУДЗЕ КІРАВАЦЬ КАМАЗАМ»

*«Дружна з Сяргеем жылі, па гаспадарцы бацькам дапамагалі. Як старэйшы, ён мне саступаў, быў абаронцам» – успамінае **Таццяна Мікалаеўна ШЛЯПАВА** пра свайго брата, які загінуў у Афганістане.*

**«Калона аўтамашын, сярод якіх быў і «КамАЗ» С. М. Шляпава, дастаўляла авіябензін і боепрыпасы ў г. Кабул. У даліне каля перавала Саланг зрабілі прывал. І ў гэты час душманы агнём з гор накрылі калону», – гэта вытрымка з кнігі «Памяць. Міёрскі раён». Кароткія біяграфічныя звесткі, невялікі партрэтны здымак юнака, чыё жыццё абарвалася ў 19 год.**

– Столькі часу прайшло, але і цяпер цяжка пра гэта ўспамінаць, – гаворыць родная сястра воіна-інтэрнацыяналіста Таццяна Шляпава.

Жыве Таццяна Мікалаеўна ў невялікай вёсцы Парадні, што ў Язненскім сельсавеце. У бацькоўскім доме, дзе прайшло іх з Сяргеем дзяцінства. На жаль, сустрэцца асабіста не атрымалася. На момант нашай журналісцкай паездкі ў Язненскі сельсавет яна знаходзілася ў дачкі ў Полацку. Пагутарылі па тэлефоне.

– За Сяргея я маладзей на тры гады. Жылі дружна, не сварыліся. Памятаю, як разам нямецкую мову вучылі. Ён дамашнія заданні рыхтаваў, а я побач сядзела і словы паўтарала. Пасля мне прасцей было з гэтым прадметам, – расказвае субяседніца. – З дзяцінства брат любіў тэхніку. Наш тата працаваў у саўгасе трактарыстам, часта браў яго з сабой на работу.

Пасля Істаўскай васьмігодкі Сяргей Шляпаў скончыў прафесійна-тэхнічнае вучылішча ў Боркавічах. На малую радзіму вярнуўся з правамі вадзіцеля і трактарыста. З задавальненнем круціў баранку саўгаснага трактара.

– У армію Сяргей пайшоў у кастрычніку 1984 года. На некалькі месяцаў пазней свайго тэрміну, – працягвае расповяд Таццяна Мікалаеўна. – Не хапала трактарыстаў, а работы на палях летам і ў пачатку восені шмат. Тагачасны дырэктар саўгаса Іван Міронччык дамаўляўся, каб Сяргея пазней забралі. Пасля адчуваў сябе вінаватым перад нашымі бацькамі і не раз заўважаў, што калі б хлопец пайшоў у армію ў свой час, можа быць, усё інакш бы склалася. Але хто ведае. Відаць, так лёс наканаваў.

На службу Сяргея праводзілі родныя, сябры, аднавяскоўцы. Прыехаць на прысягу не маглі, бо прымаў яе ў Таджыкістане. Адтуль даслаў дадому адзіны ліст.

– Пісаў, што будзе на КамАЗе вазіць авіяцыйны бензін. Быў рады зноў мець справу з тэхнікай, – прыгадвае Таццяна радкі з пісьма, якое пасля перадалі ў Істаўскую школу. – Пра Афганістан ні слова. А мы і падумаць не маглі, што такіх маладых хлопцаў могуць туды адправіць.

Да свайго дваццацігоддзя Сяргей Шляпаў не дажыў тры месяцы. Загінуў 24 сакавіка 1985 года. Пахаваны ў Ісце. Пакуль у вёсцы дзейнічала школа, вучні даглядалі магілу земляка. Прыходзілі дапамагаць па гаспадарцы яго бацькам. Цяпер пахаванні брата і таты з мамай наведвае Таццяна Мікалаеўна. Кожны год 15 лютага прыходзіць ушанаваць памяць Сяргея разам з ваенным камісарам раёна і былымі воінамі-афганцамі. Беражліва захоўвае дзіцячыя фотаздымкі, партрэт брата і яго пасмяротную ўзнагароду.

Будні ў Таццяны ідуць сваёй хадой. Працавала бухгалтарам у саўгасе «Дзісенскі», затым у КУП «Язна». Цяпер загадвае фермай. Дома спраўляецца з клопатамі разам з мужам, якога, як і брата, завуць Сяргей. Наведвае ў Полацку і чакае ў госці дачок Кацярыну і Анастасію з унучкамі.

У кругазвароце паўсядзённасці ўспамінае роднага брата, якога страціла ў 16 год.

**Кацярына РЫНКЕВІЧ**